# УВАСАБЛЕННЕ ФІЛАСОФІІ ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛІЗМУ Ў ПАЭЗІІ В. ТРЭНАС

**Кірушкіна Марыя Іванаўна**
Настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі
“Гімназія № 51”; магістр філалагічных навук
(г. Гомель, Беларусь)

Для сучаснай літаратуры характэрна ўвасабленне філасофскіх паняццяў у мастацкай творчасці. Дадзеная адметнасць найбольш выражана ў вершаванай форме. Рэфлексійны статус маюць паэтычныя тэксты, у якіх alterego аўтара рэалізуецца пасродкам экспрэсіўнага выражэння думкі, спалучанага з пэўным ідэйна-эстэтычным досведам. Стрыманасць у выяўленні эмоцый, аналітыка-сінтэзуючыя развагі, філасафічнасць, медытатыўнасць, засяроджанасць на ўнутраным свеце асобы складаюць аснову мастацка-эстэтычнай сістэмы сучаснай жаночай паэзіі.

У паэзіі В. Трэнас увасоблены мастацкая альтэрнатыва катэгорый жыцця і смерці, а таксама рэалізацыя ўнутраных перажыванняў аўтара праз успрыманне пейзажных замалёвак. Філасофія экзістэнцыялізму, глыбокі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

псіхалагізм, ірацыяналізм думкі складаюць мастацкую канцэпцыю паэткі. Жыццё, паводле аўтара, сузалежнае болевым адчуванням. Душэўны разлад, неспакой, катэгарычнае адмаўленне сабе ў шчасці нараджаюць у паэзіі В. Трэнас пачуццё збянтэжанасці пры аналізе свайго лёсу: "*ёсць боязь назаўсёды стаць шчаслівым // я – дзіўны боль // той бой пад першым снегам // мая душа з тваёй не мае выйсця*"[1, с. 12].

Вытлумачэнне жыццёвых рэалій вымагае ад лірычнага суб'екта (гераіні) фарміравання сістэмы такіх каштоўнасцей, дзе жыццё было раўназначнае смерці: "*паміраю ў пачатку верасня. Цёплая восень // толькі сніцца. На смачныя мары злятаюцца восы*" [1, с. 9]. Адчуванне смерці суправаджаецца ірацыянальным мысленнем наконт абсурднасці быцця. Чалавек сутыкаецца з хаатычнасцю свету, але пры гэтым ён адчувае, што імкнецца да шчасця і гармоніі. Згодна з эстэтычна-філасофскім досведам В. Трэнас, асбурд нараджаецца ў гэтым сутыкненні паміж чалавекам і неразумнай маўклівасцю свету. Катэгорыя смерці – гэта вынік супрацьлегласцей, што ўзнікаюць паміж асобай і рэчаіснасцю:

*памнажаюцца думкі, выходзяць крывёю з носа,*
*анемія душы, я не ў стане такое зносіць,*
*як з далонню маёй цалаваліся белыя ружы,*
*уцякаў з галавы новы вершык, нервовы і скрушны.*
*быццам слёзы з маіх вачэй для цябе атрута,*
*гэй, хадзем тусавацца ў пекле, там будзе крута,*
*свет навучыць цябе жыццё малявацць з натуры,*
*ты пакінеш зубамі след на празрыстай скуры* [1, с. 26].

Паводле А. Камю, "свядомасць смерці з'яўляецца поклічам турботы, і экзістэнцыя тады звяртаецца сама да сябе ў сваім прыватным поклічы свядомасці" [2, с. 36]. Экзістэнцыйны сум вымушае лірычнага суб'екта (гераіню) не адракацца ад зямнога існавання. Свядомасць асобы падпарадкавана несуцяшальнай праўдзе жыцця. Натуральна, умовай маральнага ўладкавання з'яўляецца тое, што чалавек – вечная ахвяра сваёй жа праўды, і яго імкненне да свабоды выклікае маральны бунт і пераацэнку каштоўнасцей. У такім выпадку псіхалогія душы асобы залежыць ад знешняга стану абставін, ад маральнага выбару. "Свядомасць і бунт – абедзве формы адмаўлення – супрацьлеглыя адрачэнню" [2, с. 56]. Унутраны разлад душы выклікае супярэчлівыя пачуцці: "*трэба выплакаць, пэўна, некалькі літраў слёз, // каб душу асушыць і знутры запаліць святло, // сцяўшы зубы, глядзець, як сцябецца з цябе твой лёс*" [1, с. 64]. Паводле паэткі, адчуць сваю экзістэнцыю ў межах рэальнага сацыяльнага кантэксту немагчыма. Метафізіку жыцця складана асэнсаваць з пункту гледжання логікі. Таму экзістэнцыйны суб'ектывізм В. Трэнас засяроджвае ўвагу на ірацыянальным падыходзе пры аналізе



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

быційных катэгорый. Захаванне ідэалу адзінай жыццёвай праўды паводзін з'яўляецца бессэнсоўным, паколькі ўсё вырашае лёс. Замкнутасць душы не дазваляе паўнавартасна ацэньваць акаляючы свет, бо кожнаму чалавеку прадвызначана свая роля: "*у кожнай сняжынцы – працяг нечага верша // у рысах тваёй далоні працяг рысаў нечай далоні // і людзі імкнуцца быць некім найперш, а // сабой – не, бо гэта значыць ужо не быць* [1, с. 47].

Анталагічны характар разваг лірычнай гераіні канцэнтруецца на праблеме духоўнага самаўдасканалення. Стомленасць душы выклікае адпаведныя перажыванні: "*Душа бы зламанае ссохлае дрэўца // спякотна, і целу няма як сагрэцца // ад стомы ў чаканні чарговай сустрэчы* [1, с. 47].

Адмаўленне сабе ў шчаслівым існаванні нараджае ў свядомасці лірычнай гераіні глыбокі псіхалагічны досвед, які можна ўмоўна спалучыць з тэзісам А. Камю [2]: "Чалавек увесь час пытаецца (чакае), а супрацьлеглы свет маўчыць". У вершах паэткі быційны саюз катэгорый жыцця і смерці мае несуцяшальны характар: свабодны жыццёвы выбар з'яўляецца афектыўным у адносінах да ўнутранага "я" асобы. Увасабленне філасофіі экзістэнцыялізму ў вершатворчасці В. Трэнас стварае такі кантэкст, дзе праблема вымярэння каштоўнасцей – другасная, паколькі існуе яшчэ праўда лёсу.

У вершатворчасці паэткі рэалізуецца паэтычная формула: прырода + псіхалогія = экзістэнцыйны пейзаж. Арыгінальнасць паэзіі В. Трэнас у тым, што ў лірычных тэкстах для стварэння мастацкай прасторы выкарыстоўваецца аналіз стану свядомасці асобы і прыродных субстанцый. Да прыкладу, у наступным вершы сумяшчаюцца ўзроўні індывідуальнай псіхалогіі і статычнасць нашага быцця:

*Тое, што побач*
*на дрэвах вісіць цішыня на світанку*
*свет надта бліскучы – балюча глядзець*
*анёлы злізалі з аблокаў смятанку*
*няможна паверыць у смерць*
*яны па кішэнях распіхваюць зоркі*
*і пэцкаюць неба ў малінавы джэм*
*хоць кожны мой ранак дрыготкі і золкі*
*няможна да шчасця бліжэй* [1, с. 23].

Паэтка па-мастацку праўдзіва "малюе" ціхі ранак гарадскога жыцця. Такое суб'ектыўнае асэнсаванне пачатку раніцы дазваляе В. Трэнас выкарыстоўваць прынцып экзістэнцыяльнай філасофіі – "я і іншыя" ў інтэрпрэтацыі аб'ектыўнай рэчаіснасці. Філасофскае тлумачэнне каштоўнасці такога існавання асобы займае ў канцэпцыі паэткі трансцэндэнтную пазіцыю, г.зн. узвышаецца над межамі існага быцця, што прыводзіць да стварэння арыгінальных мастацкіх вобразаў – "вісіць цішыня", "анёлы злізалі смятанку" і г.д. Пачуццё няўпэўненасці ў асабістай дзейнасці прыводзіць да



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

імкнення сцвердзіць сябе і сваё жаданне атрымаць шчасце, нават калі ў сферы чалавечых адносін будуць "анёлы". Свет жыццёвых фрагметаў рэалізаваны неўсвядомленым асобы, што патрабуе адпаведнай гульні святла і ценю, сімвалічнай колеравай гамы – "бліскучы", "малінавы" і г.д.

Рухі прыроды цесна звязаны з унутраным станам лірычнай гераіні і ў наступным вершаваным тэксце:

*калі заходзіць сонца,*
*неба нібы выкладзена апельсінамі,*
*і ў мяне, калі я гляджу на яго,*
*твар робіцца памаранчавым,*
*а вочы набываюць колер*
*мора, у якое кінулі сонца.*
*але тое не ў гэтым жыцці,*
*не ў гэтым* [1, с. 79].

Адзінота душы, адчуванне трывогі дазваляе лірычнай гераіні стварыць сітуацыю, дзе з'явы і рэчы выклікаюць падобныя пачуцці. Неба, захад сонца выконваюць функцыю такіх мастацкіх дэталей, якія адлюстроўваюць унутраны свет і псіхалогію лірычнага суб'екта – так паэтка стварае "памаранчавы настрой" верша.

Такім чынам, для паэзіі В. Трэнас характэрны сінкрэтызм мастацкага мыслення – увасабленне ў лірычных тэкстах філасофіі экзістэнцыялізму, псіхалогіі і адметных жывапісных прыёмаў.

**Літаратура**

1. Трэнас, В. Экзістэнцыйны пейзаж / В. Трэнас. – Мінск : Галіяфы, 2008. – 84 с.
2. Камю, А. Миф о Сизифе. Бунтующий человек / А. Камю. – М. : Попурри, 1998. – 121 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова